**Урбан, В. В.** Жарганізмы / В. В. Урбан // Культура Беларусі : энцыклапедыя. Т. 3. / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П.Броўкі, 2012. – С. 618 – 619.

**ЖАРГАНІЗМЫ**, словы жаргоннай лексікі, якія з пэўнай стылістычнай мэтай ужываюцца за межамі жаргону (гл. Жаргон) у мастацкай літаратуры або ў гутарковай мове. У мастацкі кантэкст Ж. уводзяцца з мэтай характарыстыкі дзеючых асоб або апісання асяроддзя, у якім знаходзяцца персанажы.

> – Ану, з гарызонта... Башку адгрызу...
>
> І нібы з роздумам:
>
> – Тля ты копчаная...
>
> І, як спуджаны верабей, кідаўся каторы філон на другі канец барака, зашываўся на нары, і чуваць было, як сапеў ён з перапуду, прыводзіў да парадку свае думкі, пачуцці – то ж дагадзі чалавеку, – і, аддыхаўшы, набіраўся смеласці – на шэпты, спачуванні, уздыхі (М.Лынькоў. «Баян»).

Ж. – гэта не зыходныя, а штучныя (умоўныя) назвы агульнавядомых паняццяў і рэалій аб’ектыўнай рэчаіснасці, таму выкарыстанне Ж. у творах мастацкай літаратуры павінна быць абмежавана і стылістычна абгрунтавана. Са стылістычнай мэтай Ж. выкарыстоўвалі ў сваіх творах В. Дунін-Марцінкевіч, Янка Купала, М. Гарэцкі, М. Лынькоў, Б. Мікуліч і інш. Разнавіднасцю Ж. з’яўляюцца аргатызмы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ